# Антонаў Аляксей Інакенцьевіч



**Дата нараджэння:** 28 (15) верасня 1896

**Дата смерці:** 18 чэрвеня 1962

**Месца нараджэння:** Гродзенская губерня, г. Гродна

**Месца подзвігу:** БССР

**Дата подзвігу:** 1944

**Узнагароды:** 3 ордэна Леніна;
4 ордэна Чырвонага Сцяга;
ордэн «Перамога»;
2 ордэна Суворава I ступені;
ордэн Кутузава I ступені;
ордэн Айчыннай вайны I ступені;
ордэны Польшчы, Францыі, Югаславіі, Чэхіі, ЗША, Манголіі.

**Ушанаванне ў Беларусі:**
г. Гродна – школа № 11, вуліца, музей мемарыяльная дошка.

**Антонаў Аляксей Інакенцьевіч** (28 (15) верасня 1896 – 18 чэрвеня 1962) – савецкі военачальнік, генерал арміі (1943), член Стаўкі ВГК, начальнік Генеральнага штаба ў 1945–1946 гадах. Праславіўся як таленавіты штабны афіцэр. Удзельнічаў у распрацоўцы практычна ўсіх значных аперацый савецкіх войскаў у Вялікай Айчыннай вайне з снежня 1942. Удзельнік Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый саюзнікаў.

Кавалер ордэна «Перамога», адзіны з усіх узнагароджаных савецкіх военачальнікаў ў званні Генерала арміі.

Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1931) і акадэмію Генштаба (1937). У арміі з 1916, у Чырвонай Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. З 1938 на выкладчыцкай рабоце. У Вялікую Айччынную вайну начальнік Штаба Паўднёвага, Паўночна-Каўказскага і Закаўказскага франтоў, Чарнаморскай групы войскаў. З 1942 1-шы нам. начальніка Генштаба і начальнік Аператыўнага ўпраўлення, удзельнік распрацоўкі плана Беларускай аперацыі 1944.

З лютага 1945 начальнік Генштаба, удзельнік Крымскай і Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцый. У 1946–1948 і з 1954 1-шы нам. начальніка Генштаба, з 1955 адначасова начальнік Штаба Аб`яднаных узброеных сіл дзяржаў – удельніц Варшаўскага Дагавора.

Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1946 года.

Памёр 18 чэрвеня 1962. Пахаваны на Чырвонай плошчы ў Маскве.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Антонаў** Аляксей Інакенцьевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 1. – Мн. : 1996. – С. 387.
2. **Антонаў** Аляксей Інакенцьевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мн., 1993. – С. 123–124.
3. **Антонаў** Аляксей Інакенцьевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945 : Энцыкл. – Мн., 1990. – С. 39.
4. **Антонов** Алексей Иннокентьевич / Долготович, Б. Д. // От парада надежды – к параду Победы : граждане Респ. Беларусь – участники парада 7 нояб. 1941 г. и парада Победы 24 июня 1945 г. – Минск, 2005. – С. 196.
5. **Антонов** Алексей Иннокентьевич // Их именами названы… : энциклопедический справочник / БелСЭ; редкол.: И. П. Шамякин [гл. ред.] и др. – Минск, 1987. – С. 34–35.
6. **Боков, Б.** Белорусский генерал армии Антонов / Борис Боков // Рэспубліка. – 2004. – 7 ліпеня. – С. 4.
7. **Воробьев, В.** Кавалер бриллиантовой звезды : 110 лет назад в Гродно родился генерал армии Антонов / В. Воробьев // СБ. Беларусь сегодня. - 2006. – 27 сентября. – С. 8.
8. **Дайнес, В. О.** Генерал Антонов / Владимир Дайнес. – Москва : Вече, 2015. – 349 с. – (Кавалеры ордена «Победа»).
9. **Долготович, Б. Д.** Антонов Алексей Иннокентьевич : [1896–1962] / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник. – Минск, 2008. – С. 196–197.
10. **Долготович, Б. Д.** Военачальники земли белорусской : энцикл. справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн, 2005. – 288 с.
11. **Гаглов, И. И.** Генерал армии А. И. Антонов / И. И. Гаглов. – 2-е изд., доп. – Москва : Воениздат, 1987. – 160 с. – (Советские полководцы и военачальники).
12. **Галоўка, С.** Стратэг Перамогі – генерал Антонаў / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2018. – № 6. – С. 58–64.
13. **Генерал** «Победы» Алексей Антонов. – Режим доступа: https://belhistory.by/2020/08/06/general-pobedy-aleksej-antonov/. – Дата доступа. 08.12.2020.
14. **Журавков, М. А.** Военачальники Гродненщины в годы Великой Отечественной войны / М. А. Журавков // Гісторыя і грамадазнаўства. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2016. – № 7. – С. 12–16.
15. **Иоффе,Э. Г.** Советские военачальники на белорусской земле : путеводитель по местам жизни и деятельности / Э. Г. Иоффе. – Минск : Полымя, 1988. – 239 с.
16. **Иоффе,Э. Г.** Кавалер ордена «Победа» / Э. Иоффе // Народная газета. – 2008. – 19 чэрв. – Прилож. : Союзное вече. – С. IV.
17. **Кавалер** ордена «Победа» из Гродно. – Режим доступа: http://www.warmuseum.by/index.php/yubilyary/518-kavaler-ordena-pobeda-iz-grodno. – Дата доступа. 08.12.2020.

18. **Корнилович, Э. А.** Антонов Алексей Иннокентьевич / Э. А. Корнилович / /Беларусь: созвездие политических имен : историко-биографический справочник. – Минск, 2009. – С. 300.

19. **Курков, И.** Победитель – генерал Антонов // Обозреватель. – 2010. – № 18 (7 мая). – С. 9.

20. **Лубченков, Ю. Н.** Сто великих полководцев Второй мировой / Ю.Н. Лубченков. – М. : Вече, 2005. – 480 с. – (100 великих).

21. **Скромный** военспец. Кавалер Ордена Победы : к 120-летию со дня рождения выдающегося русского полководца генерала Алексея Иннокентьевича Антонова. – Режим доступа: https://mikhael-mark.livejournal.com/507238.html. – Дата доступа. 08.12.2020.

22. **Севенко, А.** Белорусское детство генерала армии Алексея Антонова / А. Севенко // Белорусская военная газета. – 2014. – 10 апр. (№ 136).

23. **Севенко, А.** Стратегия победы : [об Алексее Иннокентьевиче Антонове (1896, Гродно – 1962), советском военном деятеле, генерале армии] / А. Севенко // Гродзенская праўда. – 2014. – 12 красав. – С. 7.

24. **Старый** Архивариус. Секреты Старого Архивариуса : уроженцы Беларуси – выдающиеся военачальники Великой Отечественной войны [в том числе Антонов А. И.] // Архівы і справаводства = Архивы и делопроизводство. – 2015. – № 2. – С. 152-156.

25. **Чибисов, И.** Наш земляк – генерал Антонов / Игорь Чибисов // Армия. – 2011. – № 4. – С. 37–41.

**Воробьев, В.** Кавалер бриллиантовой звезды : 110 лет назад в Гродно родился генерал армии Антонов / В. Воробьев //  СБ. Беларусь сегодня. -  2006. – 27 сентября. – С. 8.

# КАВАЛЕР БРИЛЛИАНТОВОЙ ЗВЕЗДЫ

110 лет назад в Гродно родился генерал армии Антонов

Он был единственным в генеральском звании, награжденным орденом «Победа». Эту высочайшую полководческую награду давали, как известно, только маршалам. Он в мельчайших деталях проработал операцию «Багратион», освободившую его родную Белоруссию. 27 (15) сентября – 110 лет со дня рождения нашего земляка генерала армии Алексея Антонова.

**Первые маневры**

Семья Антоновых была обыкновенной семьей командира батареи с небольшим доходом. Алексей даже какое-то время пытался работать на заводе в Петербурге, но вскоре был призван в армию. В 1916 году он проходит обучение в Павловском училище. Участвуя в боях Первой мировой войны, молодой офицер был ранен и награжден орденом святой Анны IV степени с надписью «За храбрость».

Когда грянула революция, он поддержал ее сразу. После гражданской – он уже опытный командир с хорошей боевой школой. Поэтому вскоре его рекомендуют в академию имени Фрунзе. Начальником оперативного отдела штаба Харьковского военного округа он впервые проявляет себя как военный стратег: разрабатывает крупные маневры с участием танковых, механизированных частей и воздушных десантов. Затем снова учеба в академии Генштаба и назначение начальником штаба Московского военного округа, которым в то время командовал маршал Буденный.

**«В войсках он был легендой...»**

Началась Великая Отечественная война. В августе 1941 года генерал-майор Антонов возглавил штаб Южного фронта. В ноябре была проведена Ростовская наступательная операция, освободили Ростов-на-Дону. Противника удалось отбросить от города на десятки километров. После завершения этой редкой для начала войны успешной операции Антонов стал генерал-лейтенантом, а на его кителе появился первый орден Красного Знамени.

Вот как вспоминает об Антонове Вадим Прокофьевич Садовниченко, генерал-лейтенант в отставке:

– Мне, солдату переднего края, первому номеру ручного пулемета ДП 1-го эскадрона 139-го кавполка 134–й кавдивизии, в ноябре 1941–го приходилось участвовать в боях на Южном и Закавказском фронтах. Начштаба фронта в ту пору был Антонов. Солдатский телеграф из уст в уста предавал рассказы о его незаурядных личных качествах. Наши командиры верили в него безоговорочно.

Серьезные испытания выпали на долю новоиспеченного генерал-лейтенанта летом 1942-го. На Харьковском направлении противник прорвал оборону, подбирался к Сталинграду. По приказу Ставки были объединены войска Северо-Кавказского и Южного фронтов. Новый Северо-Кавказский фронт возглавил маршал Буденный, а начальником штаба стал Антонов. За оборону Кавказа Антонову вручили второй орден Красного Знамени.

После удачной Кавказской операции карьера генерала развивалась стремительно. В декабре 1942-го Антонова назначают начальником Оперативного управления, заместителем начальника Генштаба. Он трижды в сутки ходит на доклад к Верховному Главнокомандующему. Он умел тонко чувствовать и предугадывать настроения вождя. Командующие войсками, приезжавшие в Ставку, прежде чем идти к Верховному Главнокомандующему, шли к Антонову – советовались.

**Главная операция**

Антонов – один из главных стратегов операции «Багратион». Необходимо было привести в полную боевую готовность к наступлению войска 4 фронтов – почти полтора миллиона человек! Военные историки убеждены, что именно операция «Багратион» стала для Антонова своего рода звездным часом – в полной мере раскрыла его талант стратега и организаторские способности.

В феврале 1944-го генерала Антонова награждают орденом Суворова I степени и в июле этого же года, после освобождения Минска, вторым орденом Суворова I степени. Он уже генерал армии, возглавляет Генштаб, один из руководителей крупных стратегических наступательных операций завершающих Великую Отечественную, – Восточно-Прусской, Висло-Одерской, Будапештской, Пражской, Берлинской.

В феврале 1945 года генерал Антонов принимает участие в Ялтинской конференции, а затем в Потсдамской. Позже он разрабатывал план войны с империалистической Японией.

В честь его 110–летия в нашей стране пройдут памятные мероприятия в Гродно, в Министерстве обороны, Военно-научное общество проведет конференцию в Минске. И мы все еще раз вспомним выдающегося полководца, одного из творцов Великой Победы генерала армии Алексея Антонова.

***Владимир ВОРОБЬЕВ,***

*председатель Военно–научного общества, генерал–майор в отставке,*

*ветеран Великой Отечественной войны*

**Галоўка, С.** Стратэг Перамогі – генерал Антонаў / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2018. – № 6. – С. 58–64.



# Стратэг Перамогі – генерал Антонаў

**Мы добра ведаем імёны палкаводцаў – маршалаў, Герояў Савецкага Саюза Г. Жукава, К. Ракасоўскага, А. Васілеўскага, І. Конева, Р. Маліноўскага, якія адыгралі важную ролю ў разгроме савецкім народам нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта пад іх камандаваннем былі выйграны вырашальныя бітвы Вялікай Айчыннай вайны, што прывялі да канчатковага краху мілітарысцкіх планаў гітлераўскай Германіі. Але ўсё ж ці толькі яны адны з'яўляюцца стратэгамі Вялікай Перамогі? І на гэтае заканамернае пытанне ёсць адказ. Акрамя цэлай плеяды знакамітых савецкіх военачальнікаў, быў чалавек, які, на агульную думку, унёс вызначальны ўклад у распрацоўку найважнейшых аперацый, праведзеных Чырвонай арміяй у гады вайны. Гэта – наш зямляк, ураджэнец Гродна Аляксей Інакенцьевіч Антонаў. У ваеннай гісторыі СССР ён адзіны генерал, удастоены найвышэйшай савецкай палкаводчай узнагароды – ордэна «Перамога».**

## Выпрабаванні лёсу

Ваенная прафесія Аляксею Антонаву была нібы наканавана. Нарадзіўся ён 15 верасня 1896 года ў сям'і афіцэра Расійскай арміі. Ды і бацька будучага генерала, Інакенцій Аляксеевіч Антонаў, быў патомным ваенным. Ён выхоўваўся ў кадэцкім корпусе, скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча ў Маскве, дзе звязаў свой лёс з артылерыяй. Пасля заканчэння навучання быў накіраваны ў Хабараўск, дзе і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Тэрэзай – дачкой шляхціца з-пад Ліды Ксаверыя Александровіча, сасланага ў Сібір за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гадоў пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Інакенцій Антонаў самастойна падрыхтаваўся да паступлення ў Мікалаеўскую акадэмію Генеральнага штаба Расійскай арміі, нават вывучыў французскую і нямецкую мовы. Ён паспяхова здаў экзамены, але ў прэстыжную вышэйшую ваенную навучальную ўстанову залічаны не быў з-за каталіцкага веравызнання жонкі. У канцылярыі акадэміі яму прапанавалі ўгаварыць нарачоную перайсці ў праваслаўе, і тады, маўляў, ніякіх перашкод з залічэннем не будзе. Але Інакенцій Аляксеевіч не стаў прымушаць сваю каханую мяняць веравызнанне і ў рэшце рэшт там жа, у Санкт-Пецярбургу, атрымаў накіраванне ў 26-ю артылерыйскую брыгаду, якая дыслацыравалася практычна на радзіме жонкі, у Гродне.

У сям'і Антонавых дзяцей – Аляксея і яго старэйшую сястру Людмілу – выхоўвалі ў традыцыях патрыятызму. Прычым як рускага, так і польскага. Тым не менш, жывучы ў асяроддзі ваенных, сын і ўнук патомных афіцэраў Расійскай арміі не планаваў звязваць лёс са службай у войску: зачараваны цудоўным гродзенскім ландшафтам, хлопчык быў перакананы, што ў сваім жыцці будзе займацца вывучэннем прыроды.

Калі Аляксею яшчэ не споўнілася і васьмі гадоў, сям'я пераехала ў горад Астрог Валынскай губерні, куды бацьку перавялі на новае месца службы: ён атрымаў прызначэнне на пасаду камандзіра батарэі 32-й артылерыйскай брыгады. На гэтым для будучага савецкага генерала скончыўся перыяд бесклапотнага дзяцінства, праведзенага ім у Гродне. Горад гэты ў канцы жыцця ён збіраўся наведаць, але так і не змог выкраіць часу ў складаным графіку службы.

На новым месцы Аляксей паступае ў гімназію і па-ранейшаму захапляецца прыродазнаўствам. У 1908 годзе

сям'ю напаткала вялікае гора – нечакана памірае бацька. Гэты ўдар вельмі моцна адбіваецца і на матэрыяльным становішчы Антонавых: дзеці жывуць за кошт ваеннай пенсіі, маці падзарабляе рэпетытарствам. У 1914-м, калі грымнула Першая сусветная вайна, Тэрэза Ксавер'еўна з дзецьмі перабіраецца да сваіх блізкіх сяброў у Петраград. Але злы рок і там наганяе іх сям'ю – праз год пасля складанай аперацыі маці памірае. І ўсё ж асірацелы Аляксей не апускае рук, заканчвае гімназію і восенню 1915 года паступае на фізіка-матэматычны факультэт Петраградскага ўніверсітэта. Праўда, вучыцца юнаку не было на што, таму праз два месяцы ён пакідае ўніверсітэт і ідзе працаваць на завод.

## Кадравы ваенны

Вясной 1916 года А. Антонава прызываюць у войска і як былога студэнта накіроўваюць у Паўлаўскае ваеннае вучылішча. Пасля кароткатэрміновага абучэння, у снежні таго ж года, ён у званні прапаршчыка лейб-гвардыі Егерскага палка трапляе на фронт. У ліпені 1917-га на Паўднёва-Заходнім фронце, у Галіцыі, будучы генерал атрымлівае асколачнае раненне ў галаву і… сваю першую ўзнагароду – ордэн Святой Ганны IV ступені з надпісам «За адвагу».

Параненага А. Антонава адправілі на лячэнне ў Петраград, дзе яго і заспелі рэвалюцыйныя падзеі 1917 года, у якіх, праўда, актыўнага ўдзелу яму прымаць не давялося. Пасля выздараўлення Аляксей Антонаў дэмабілізуецца з арміі і ўладкоўваецца на працу статыстыкам у Наркамхарчы. Адначасова, каб ажыццявіць сваю колішнюю мару – стаць ляснічым, паступае ў Петраградскі лясны інстытут. Аднак вучыцца давялося нядоўга: 11 красавіка 1919 года А. Антонава зноў прызываюць у армію, на гэты раз у Чырвоную. Накіраванне 23-гадовы малады чалавек атрымаў у 1-ю Маскоўскую працоўную дывізію, дзе яго прызначылі памочнікам начальніка штаба.

У складзе гэтага і іншых савецкіх ваенных падраздзяленняў А. Антонаў ваяваў з белагвардзейцамі пад Луганскам, вызваляў Растоў-на-Доне і Новарасійск, абараняў Кахоўскі плацдарм, фарсіраваў Сіваш… У 1922 годзе наш зямляк працягвае службу спачатку ў якасці начальніка аператыўнай часці, а затым і памочніка начальніка штаба 15-й Сівашскай дывізіі.



◀ А. Антонаў – начальнік аператыўнай часці штаба 15-й Сівашскай стралковай дывізіі. 1922 год

У 1928 годзе А. Антонаў паступае на камандны факультэт Ваеннай акадэміі імя Фрунзэ, які заканчвае ў 1931-м. Пасля года службы ў дзеючых войсках яго зноў накіроўваюць у акадэмію, на толькі што створаны там новы факультэт – аператыўны. У 1933 годзе Аляксей Інакенцьевіч яго закончыў і атрымаў накіраванне на пасаду начальніка аператыўнага аддзела штаба Харкаўскай ваеннай акругі. Калі ў 1936-м ствараецца Акадэмія Генеральнага штаба Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, А. Антонава запрашаюць у першы набор яе слухачоў. Праз год вучобы загадам наркама абароны К. Варашылава яго прызначаюць начальнікам штаба Маскоўскай ваеннай акругі. А ў канцы 1938 года адбываецца новы паварот у лёсе: Аляксей Інакенцьевіч Антонаў становіцца выкладчыкам Акадэміі імя Фрунзэ.

## У Генеральным штабе

Вялікую Айчынную вайну наш зямляк сустрэў на пасадзе намесніка начальніка штаба Кіеўскай асобай ваеннай акругі. Са жніўня 1941-га А. Антонаў – начальнік штаба Паўднёвага фронту. Пад яго кіраўніцтвам была распрацавана і затым паспяхова ажыццёўлена Растоўская аперацыя. У пісьме да сястры ад 9 красавіка 1942 года Аляксей Інакенцьевіч пісаў: «Можаш мяне павіншаваць з ордэнам Чырвонага Сцяга. Атрымаў яго за Растоўскую аперацыю і разгром танкавай арміі ген. Клейста... Гэта было першае вялікае паражэнне немцаў». У пачатку снежня 1942 года начальнік Генеральнага штаба А. Васілеўскі, пасля адабрэння яго кандыдатуры асабіста І. Сталіным, прапанаваў А. Антонаву пасаду свайго намесніка – начальніка Аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба.

Маршал А. Васілеўскі па распараджэнні Вярхоўнага Галоўнакамандуючага большую частку часу знаходзіўся на франтах. У яго адсутнасць усю адказнасць за дзейнасць Генштаба нёс менавіта Аляксей Інакенцьевіч. Асноўным у яго працы было стратэгічнае планаванне. Пачынаючы з Курскай аперацыі, А.І. Антонаў удзельнічаў у распрацоўцы ўсіх ключавых аперацый і кампаній Чырвонай арміі. Генерал-палкоўнік С. Штаменка, успамінаючы перыяд сумеснай працы з нашым земляком, зазначаў: «Практычна Генштаб з 1943 года ўзначальваў нам. начальніка Генштаба генерал арміі А.І. Антонаў. Вялікі працаўнік і выдатны знаўца ўсяго, чым жыве Генштаб, Аляксей Інакенцьевіч фактычна трымаў усе ніці аператыўнага кіравання баявымі дзеяннямі ў сваіх руках. Аб'ём работы быў неймаверна вялікі, але пры дапамозе кваліфікаваных генералаў і афіцэраў Генштаба за кошт сваёй багатай эрудыцыі і тады яшчэ маладых сіл, ён паспяваў выконваць усю асноўную работу і рабіў гэта бездакорна... Па некалькі разоў на дзень са старанна падрыхтаванымі дакладамі яму даводзілася бываць у Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І.В. Сталіна... Аўтарытэтам Антонаў карыстаўся і за тое, што асмельваўся, калі патрэбна, пярэчыць Сталіну і ўжо ва ўсякім разе выказваць свае меркаванні».

▼ Савецкая дэлегацыя на Ялцінскай канферэнцыі. Генерал А. Антонаў – стаіць у цэнтры. 1944 год



Самай яркай старонкай ваеннай дзейнасці выдатнага ваеннага стратэга генерала А. Антонава стала Беларуская наступальная аперацыя, вядомая пад назвай «Баграціён». Вясной 1944 года, ацаніўшы і ўзважыўшы прапановы, што паступалі ў Генштаб ад камандуючых франтамі аб магчымых дзеяннях на іх напрамках, улічыўшы дыслакацыю і стан армій праціўніка, намеснік начальніка Генштаба А.І. Антонаў з удзелам вядучых спецыялістаў распрацаваў прынцыпова новую аператыўную задуму. Галоўным у летняй кампаніі 1944 года станавіўся разгром беларускай і львоўскай варожых груповак. Звязаныя з гэтым аперацыі намячаліся на велізарныя прасторы, а падрыхтоўка нагадвала складана закручаны дэтэктыў.

Была арганізавана шырокамаштабная кампанія па дэзынфармацыі праціўніка. З гэтай мэтай у войсках разгарнулі работу па ўдасканаленні абароны. Каб збіць з панталыку нямецкую разведку, прынялі, як піша С. Штаменка, і такія меры: «Франтавыя, вайсковыя і дывізіённыя газеты публікавалі матэрыялы толькі па абарончай тэматыцы. Уся вусная агітацыя была нацэлена на ўтрыманне занятых пазіцый. На месцы шырока прымяняліся макеты баявой тэхнікі і іншыя фальшывыя аб'екты. Ля макетаў паставілі зенітікі, арганізаваўшы ў той жа час патруляванне

знішчальнікаў – для «супрацьпаветранай абароны». Бачнасць і праўдападобнасць ілжэаб'ектаў прадпісвалася праверыць фатаграфаваннем з паветра...». І немцы паверылі. У сваіх пасляваенных успамінах камандуючы 4-й арміяй вермахта Курт фон Тыпельскірх адзначыў, што гітлераўская вярхушка чакала наступлення на поўдні і ў Прыбалтыцы, але ніяк не ў цэнтры, у Беларусі.

Распрацоўка плана аперацыі «Баграціён» была завершана ў Генштабе 14 мая 1944 года. Канчатковы варыянт змяшчаў кароткі тэкст і карту. І толькі 20 мая, пасля роздумаў, Аляксей Інакенцьевіч завізаваў яго сваім подпісам. Яшчэ праз некалькі дзён план падрабязна абмеркавалі ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў прысутнасці маршалаў Г. Жукава і А. Васілеўскага, камандуючых франтамі і некаторых іншых военачальнікаў.

Аперацыя «Баграціён» пачалася 22 чэрвеня імкліва і праходзіла пад пільным наглядам А. Антонава. Яна працягвалася 68 дзён і завяршылася поўным разгромам магутнай нямецкай групы армій «Цэнтр», а таксама перамогамі на львоўскім і выбаргскім напрамках. Гісторыкамі ўсяго свету яна прызнана найбуйнейшай паспяховай вайсковай аперацыяй Другой сусветнай вайны: на фронце 1100 км быў утвораны 400-кіламетровы пралом і савецкія войскі атрымалі магчымасць наступаць на Захад. У выніку аперацыі «Баграціён» была цалкам вызвалена Беларусь, а таксама часткова Прыбалтыка і ўсходняя частка Польшчы.

З 17 лютага 1945 па 25 сакавіка 1946 года генерал А. Антонаў займаў пасаду начальніка Генеральнага штаба, у сувязі з чым прымаў удзел у Ялцінскай канферэнцыі кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі, на якой зрабіў даклад аб становішчы на савецка-германскім фронце. Як кіраўнік Генштаба ён удзельнічаў і ў рабоце першай пасляваеннай канферэнцыі краін антыгітлераўскай кааліцыі ў Патсдаме, дзе вёў перамовы з ваеннымі прадстаўнікамі саюзнікаў. На абедзвюх канферэнцыях Антонаў вылучаўся сярод іншых



▲ Калектыўнае фота ўдзельнікаў Ялцінскай канферэнцыі. Генерал А. Антонаў стаіць за І. Сталіным. 1944 год

военачальнікаў сваёй эрудзіраванасцю, веданнем сітуацыі на ўсіх франтах, быў у курсе планаў савецкага камандавання і магчымых намераў саюзнікаў, вызначаўся здольнасцю «мала гаварыць, а больш слухаць», што з'яўляецца вялікай каштоўнасцю пры перамовах.

## І нават не маршал

4 чэрвеня 1945 года генерал А. Антонаў быў узнагароджаны найвышэйшым ваенным ордэнам СССР «Перамога» – «за

▼ На адным з пасяджэнняў Патсдамскай канферэнцыі. 1945 год





▶ Генерал арміі А.І. Антонаў. Фота пачатку 1960-х гадоў

ўмелае выкананне заданняў Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў справе правядзення баявых аперацый вялікага маштабу». Узнагароджанне ўнікальнае па сваёй сутнасці, бо ўсе 14 савецкіх кавалераў ордэна, акрамя Аляксея Інакенцьевіча Антонава, мелі званні не ніжэйшыя за маршальскія. Разам з тым, як адзначаюць некаторыя ваенныя гісторыкі, з атрыманнем гэтай узнагароды пачалося і затушоўванне заслуг генерала Антонава як выдатнага ваеннага стратэга.

Прынамсі, у гэтай сітуацыі ёсць некалькі нюансаў. Па-першае, узнагарода А. Антонаву была дадзена не ў час вайны, калі ён актыўна распрацоўваў паспяховыя аперацыі Чырвонай арміі, а пасля перамогі. А па-другое, у той жа дзень з такой жа фармулёўкай ордэнам «Перамога» быў узнагароджаны і маршал С. Цімашэнка, які, будучы камандуючым рознымі франтамі, правальваў некалькі аперацый, быў зняты з камандных пасад і служыў на другарадных пасадах у Стаўцы. Прычым ва ўзнагародным лісце прозвішча С. Цімашэнкі ішло першым – з парушэннем алфавітнага парадку. Такім чынам у вачах многіх людзей, нават далёкіх ад Крамля, антонаўскі ордэн ставіўся ніжэй і, вобразна кажучы, губляў свой бляск. Беспрэцэдэнтным быў і наступны крок Вярхоўнага Галоўнакамандуючага: 26 чэрвеня 1945 года ўстанаўліваецца званне Генералісімуса Савецкага Саюза, а на наступны дзень яно прысвойваецца «выдатнаму стратэгу» Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну за перамогу над Германіяй.

Сталін выдатна разумеў, што быць геніяльным кіраўніком, які выратаваў краіну падчас вайны, – гэта значыць атрымаць самае высокае прызнанне ў народзе і бясспрэчны аўтарытэт. Таму ён не мог дапусціць, каб галоўным стратэгам перамогі ў Вялікай Айчыннай выступаў нехта іншы, а не ён. З гэтай пазіцыяй адзінага савецкага генералісімуса звязаны і той факт, што А. Антонаву так і не было прысвоена маршальскае званне, якога ён, безумоўна, заслугоўваў. І, магчыма, больш, чым іншыя военачальнікі…

У канцы сакавіка 1946 года, калі маршал А. Васілеўскі зноў узначаліў Генштаб, Аляксей Інакенцьевіч вярнуўся на пасаду яго намесніка. У лістападзе 1948 года ён быў назначаны першым намеснікам камандуючага войскамі Закаўказскай ваеннай акругі, якую затым у 1950–1954 гадах узначальваў. Пасля стварэння Аб'яднаных узброеных сіл дзяржаў Арганізацыі Варшаўскага дагавора генерала А. Антонава ў маі 1955 года пераводзяць на пасаду начальніка штаба гэтай арганізацыі, на якой ён працаваў да сваёй смерці.

## Нішто чалавечае…

А якім жа ў жыцці быў стратэг Перамогі? Як адзначаюць сучаснікі генерала, Аляксей Інакенцьевіч вельмі любіў блізкіх яму людзей, заўсёды з глыбокай павагай ставіўся да памяці сваіх бацькоў, як бясцэнныя рэліквіі захоўваў іх фотаздымкі і пісьмы. Яго слабасцю быў тэатр, захапляўся ён яшчэ і фатаграфаваннем, з ахвотай гуляў у шахматы. Лыжы, веславанне, валейбол, прагулкі па лесе і падарожжы таксама былі для генерала Антонава любімым заняткам і адначасова адпачынкам. Як чалавек пунктуальны, патрабаваў гэтага і ад іншых.

Ён шанаваў людзей шчырых, адкрытых, больш за ўсё цаніў у іх самастойнасць і адданасць справе. Яго заўсёды абуралі грубасць, нядобрасумленнасць, хлусня, непавага да чалавечай годнасці. «Аляксей Інакенцьевіч быў у вышэйшай ступені адукаваны ваенны, чалавек вялікай культуры і абаяльнасці», – такую кароткую, але ў той жа час ёмістую ацэнку даў яму ў сваёй кнізе «Воспоминания и размышления» маршал Г. Жукаў.

Генерал арміі С. Штаменка ў сваіх мемуарах таксама прыязна выказаўся аб чалавечых якасцях Аляксея Інакенцьевіча: «Мне неаднойчы даводзілася бываць у Антонава ў сям'і. У дамашняй абстаноўцы ён быў прыемным суразмоўцам і гасцінным гаспадаром. Яго жонка, Марыя Дзмітрыеўна, была яму да пары, а па характары і адносінах да людзей нечым нават да яго падобная. Нездарма ж кажуць, калі муж з жонкай доўга і добра жывуць, яны становяцца падобнымі адзін да аднаго. Усё гэта можна аднесці і да сям'і Антонавых».

Сама Марыя Дзмітрыеўна ў размовах з блізкімі неаднойчы зазначала, што Аляксей Інакенцьевіч жанаты не з ёю, а са сваёй работай. І ў гэтым яе жарце хавалася пэўная доля праўды. Генерал Антонаў, закаранелы працаголік, праводзіў на службе па 12–15 гадзін у суткі. А верная і клапатлівая жонка была яго надзейным тылам.

Аляксей і Марыя ажаніліся ў 1925 годзе на радзіме нарачонай, ва ўкраінскім Мікалаеве. І з таго часу яна стойка падзяляла з мужам нягоды і радасці ягонай службы і адначасова дбала пра сямейны камфорт, стварала хатнюю ўтульнасць. Карацей, жыла выключна для яго, бо дзяцей ім Бог не даў. І цалкам заканамерна, што ўсе галоўныя прыступкі сваёй кар'ернай лесвіцы Аляксей Інакенцьевіч пераадолеў, пакуль Марыя Дзмітрыеўна была з ім побач. Але ў 1955 годзе надзейнай спадарожніцы не стала, і жыццё генерала пацякло па іншым рэчышчы.

Пасля смерці жонкі Аляксей Інакенцьевіч стаў замкнёным, яшчэ больш паглыбіўся ў працу. Адзінай спатоляй для яго душы па-ранейшаму заставаўся тэатр. Менавіта цяга да сцэнічнага мастацтва і паспрыяла таму, што ў яго жыцці ў 1956 годзе з'явілася іншая жанчына – знакамітая савецкая балерына, прыма маскоўскага Вялікага тэатра Вольга Лепяшынская.

Пазнаёміліся яны выпадкова, зусім не ведаючы, хто з іх хто. Паводле слоў В. Лепяшынскай, адбылося гэта так: «Я выйшла з тэатра пасля спектакля, на вуліцы ішоў праліўны дождж, а службовая машына недзе затрымлівалася. На мне была вельмі прыгожая сукенка, і мне так не хацелася яе сапсаваць!.. І раптам адчыняюцца дзверцы аўтамабіля, што ад'язджаў ад тэатра, і незнаёмы мужчына прапануе мяне падвезці. Я, доўга не думаючы, даю нырца ў салон. Ён не мог пазнаць мяне, таму што я на сцэне і ў жыцці – гэта дзве зусім розныя жанчыны. Антонаў таксама быў не ў форме, а ў цывільным... Паехалі. Па дарозе міла гутарылі, і ўжо праз 10–15 хвілін я зразумела, якой высокай духоўнасці гэты чалавек. Ён выдатна размаўляў па-французску і знешне быў вельмі прывабны. Мне не хацелася пакідаць машыну і яго кампанію, і тады я прыдумала, што мне трэба ехаць на лецішча да знаёмых. «Што ж, на лецішча, дык на лецішча!» Даставілі мяне туды. Там высветлілася, што мне трэба тэрмінова вяртацца дахаты. Паехалі ў Маскву. А на развітанне ён папрасіў у мяне тэлефон. Згараючы ад нецярпення, я чакала званка, але патэлефанаваў ён толькі на чацвёрты дзень...»

Прайшло зусім няшмат часу, і 60-гадовы А. Антонаў і В. Лепяшынская, на 20 гадоў маладзейшая за яго, пачалі жыць разам. Для Аляксея Інакенцьевіча пачалося зусім іншае жыццё, чым дагэтуль. Калі раней, прыходзячы са службы дадому, ён мог расслабіцца і адпачыць, то цяпер такая магчымасць надаралася вельмі рэдка: саюз з сур'ёзным ваенным чалавекам не змяніў прывычнага ладу жыцця Лепяшынскай. Пасля кожнага спектакля, у якім яна танцавала, яе сябры-артысты дружна накіроўваліся адзначыць гэтую падзею на кватэру Антонава, дзе жыла сям'я. Не стаў мяняць



▶ Бюст А. Антонава і частка прысвечанай яму экспазіцыі ў Музеі воінскай славы СШ № 11 г. Гродна



▼ Мемарыяльная дошка на доме № 25 па вуліцы імя А. Антонава ў г. Гродне

сваіх звычак і Аляксей Інакенцьевіч: ён па-ранейшаму шмат працаваў, работа была нервовай і напружанай... Таму фінал сумеснага жыцця са знакамітай балерынай аказаўся для генерала Антонава ў нейкім сэнсе прадказальным. 18 чэрвеня 1962 года яму стала дрэнна проста ў рабочым кабінеце. Намаганні ўрачоў былі марныя: ён памёр у той жа дзень у бальніцы.

Пахаванне стратэга Перамогі праходзіла на высокім дзяржаўным узроўні. Урну з прахам Аляксея Інакенцьевіча Антонава пранеслі па Краснай плошчы тагачасныя кіраўнікі СССР і Кампартыі. Пахавалі яго 22 чэрвеня 1962 года ў Крамлёўскай сцяне.

Першыя і даволі істотныя захады па ўшанаванні памяці А. Антонава былі зроблены ў 1965 годзе ў Гродне: у гонар генерала-земляка назвалі вуліцу, яго імя было прысвоена сярэдняй школе № 11, яе вучні і настаўнікі адразу ж распачалі збор матэрыялаў для музея, які з часам размясціўся ў хаце, дзе нарадзіўся палкаводзец. Праўда, у пачатку 2000-х гадоў падчас рэстаўрацыі гэты будынак згарэў. На шчасце, музейная экспазіцыя на той час была ўжо дэманціравана і збераглася. Асноўная яе частка зараз захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. Некаторыя асабістыя рэчы Аляксея Інакенцьевіча, рэдкія фотаздымкі, перапіска вучняў з сястрой генерала і іншыя рэліквіі прадстаўлены на тэматычных стэндах і ў Музеі воінскай славы СШ № 11 г. Гродна. Ёсць вуліца імя генерала Антонава і ў Маскве, яго імя таксама прысвоена Санкт-Пецярбургскаму ваенна-тапаграфічнаму вучылішчу. У 2003 годзе Расійская асацыяцыя Герояў Савецкага Саюза і група Маршалаў Савецкага Саюза і генералаў арміі звярнуліся да кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі з хадайніцтвам аб пасмяротным прысваенні Аляксею Інакенцьевічу Антонаву звання Героя Расіі. На жаль, іх просьба не была задаволена.

Паводле слоў дырэктара гродзенскай СШ № 11 імя А. Антонава Марыны Пятроўны Кароза, у падначаленай ёй установе адукацыі праводзіцца значная героіка-патрыятычная работа. Галоўным звяном яе з'яўляецца вучнёўская навуковая канферэнцыя, прысвечаная генералу арміі А. Антонаву. Летась яна прайшла ўжо другі раз. Спачатку канферэнцыя мела агульнашкольны статус, затым – агульнагарадскі. Плануецца, што сёлета ў верасні ў ёй прымуць удзел школьнікі і навучэнская моладзь з усёй Гродзенскай вобласці.

Грамадскасць Гродна выношвае планы аб устанаўленні помніка генералу А. Антонаву. Пазалетась, калі адзначалася 120-годдзе з дня яго нараджэння, такі зварот быў накіраваны гродзенскім уладам. Але сродкаў на ажыццяўленне гэтай ініцыятывы ў гарадскім бюджэце пакуль не знайшлося. Магчыма, яны адшукаюцца на наступны год, калі мы будзем адзначаць 75-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І тады на малой радзіме вядомага палкаводца, стратэга аперацыі «Баграціён», з'явіцца нарэшце хаця б сціплы яго бюст.

**Сяргей ГАЛОЎКА**